

Вольга КРАЎЦОВА

# САЦЫЯЛЬНАЯ ПЕДАГОГІКА

## Ў СІСТЭМЕ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ

**Сацыяльная педагогіка глыбока пранікае ў прыроду самога чалавека, яна інтэгруе ў сабе народную, дашкольную, школьную, сямейную, вытворчую педагогіку з прафесійнай і гуманітарнай адукацыяй. Сацыяльная педагогіка даследуе ўплыў прыроднага і сацыяльнага асяроддзя на працэс фарміравання асобы, з аднаго боку, і абараняе асобу ад уздзеяння неспрыяльных фактараў — з іншага. Яна мае на мэце вучыць студэнтаў дзейснай працы з сям'ёй, бацькамі, грамадскасцю, дапамагчы дзіцяці ў адаптацыйны перыяд, дае ўяўленне аб асновах абароны правоў дзіцяці.**

САЦЫЯЛЬНАЯ педагогіка — параўнальна новая навука і галіна педагогікі, існуе з пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя. Але яшчэ ў V ст. да н. э. нарадзіліся ідэі аб неабходнасці ўліку сацыяльных фактараў у працэсе навучання і выхавання. Сацыяльная педагогіка адпачкавалася ад агульнай і таму ў сваёй аснове абапіраецца на прынцыпы гэтай навукі: прыродаадапаведнасць, культураадапаведнасць і гуманізм. Будучыя педагогі і выхавальнікі, якія ўлічваюць ***прынцып прыродаадапаведнасці***, прытрымліваюцца наступных правіл:

- *улічваюць палавыя і індывідуальныя асаблівасці дзяцей;*
- *абапіраюцца на станоўчы вопыт дзіцяці;*
- *развіваюць ініцыятыву і самастойнасць дзяцей.*

***Прынцып культураадапаведнасці*** з'яўляецца працягам ужо згаданага прынцыпу. Чалавек нараджаецца як біялагічная істота, становіцца ж асобай, засвойваючы сацыяльны вопыт паводзін, які перадаецца ў працэсе выхавання і развіцця.

Прынцып культураадапаведнасці выходзіць з прэстыжу агульначалавечых каштоўнасцей, уліку норм і этычных традыцый агульначалавечых і нацыянальных культур у выхаванні. Нашы студэнты правільна разумеюць такія агульначалавечыя каштоўнасці, як прызнанне самакаштоўнасці чалавека, сям'і — натуральнага асяроддзя, яго існавання, працы — асновы жыццядзейнасці, міру на зямлі — умовы жыцця, ведаў — асновы дзейнасці, культуры — гістарычна народжанага сацыяльнага вопыту.

Важнейшы прынцып усёй педагогікі і сістэмы адукацыі XXI стагоддзя — ***гуманізм*** — разумеецца як прызнанне каштоўнасці чалавека як асобы, яго права на свабоду, шчасце, развіццё і раскрыццё здольнасцей. Гэта сістэма лічыць дабрабыт чалавека крытэрыем ацэнкі сацыяльных з'яў, а роўнасць, справядлівасць, чалавечнасць — жаданай нормай зносін у грамадстве. Мэтай гуманізму з'яўляецца развіццё культуры і маральнасці, адпаведных паводзін. Нашы студэнты разумеюць прынцып гуманізму як працэс выхавання любві ў дзяцей на аснове духоўных каштоўнасцей, устаноўкі на фарміраванне асобы з высокімі інтэлектуальнымі, маральнымі і фізічнымі данымі.

Сацыяльная педагогіка як навука і сфера практычнай дзейнасці абапіраецца на шэраг методык: *даследавання, выхавання і сацыяльна-псіхалагічнай дапамогі.* Метады даследавання спрыяюць далейшаму развіццю навукі. Метады выхавання ахопліваюць выхаваўчую дзейнасць сацыяльнай педагогікі і ўключаюць:

- *аб'ект — асоба дзіцяці;*
- *мэту — развіццё і выхаванне гэтай асобы ў пэўным накірунку;*
- *змест — далучэнне дзіцяці да сацыяльнага вопыту;*
- *сродкі — арганізацыя адпаведнай дзейнасці аб'екта выхавання.*

Метады выхавання падзяляюцца на тры групы: фарміравання свядомасці, арганізацыі дзейнасці, стымулявання дзейнасці.

Асаблівае месца займаюць метады сацыяльна-псіхалагічнай дапамогі, да якіх адносяцца псіхалагічнае кансультаванне, сацыяльна-псіхалагічны трэнінг і аўтатрэнінг, дзелавая гульня.

Студэнтам неабходна засвоіць, што сацыяльная абарона грунтуецца на сукупнасці сацыяльных і юрыдычных гарантый, якія прадастаўляюць кожнаму грамадзяніну роўнасць правоў і магчымасць іх рэалізацыі. Студэнты вывучаюць дакументы і законы аб правах і свабодах дзіцяці ў грамадстве, Кодэкс аб шлюбе і сям'і, асноўныя формы дзяржаўнай дапамогі сем'ям, законы Рэспублікі Беларусь аб сацыяльнай абароне грамадзян і інш.

Веданне асноў сацыяльнай педагогікі, разуменне працэсу сацыялізацыі, уплыву ўсіх кампанентаў мікраасяроддзя на развіццё і станаўленне асобы дзіцяці дапаможа будучым педагогам і выхавальнікам аказваць дапамогу ў адаптацыі дзяцей, абараняць іх інтарэсы, папярэджваць розныя негатыўныя з'явы, берагаць здароўе і нармальную жыццядзейнасць кожнага маленькага грамадзяніна краіны.

**Вольга Міхайлаўна КРАЎЦОВА нарадзілася ў Мінску. У 1976 годзе закончыла Мінскі інстытут культуры. У 1988 годзе абараніла кандыдацкую дысертацыю на тэму «Сацыяльна-эканамічнае развіццё гарадоў Магілёўскай губерніі ў другой палове XIX стагоддзя». З 1977 года працуе ў МДПІ ім. М. Горкага. З 1989 года — на факультэце дашкольнай адукацыі.**

ЛІТАРАТУРА:

1. **Кравцова О.М.** Вопросы социальной защиты личности в курсе «Социальная педагогика» // Подготовка социальных педагогов и социальных работников: проблемы, тенденции, опыт. — Мн. — С. 109—112.
2. **Мустафаева Ф.А.** Основы социальной педагогики. — М., 2001.
3. **Социальная педагогика:** Курс лекций/ Под ред. М.А. Галагузовой. — М., 2001.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ